XVIII веках// Вопросы истории. 2003. № 12. С. 47–61; *Бирюков А. В.* Российско-чеченские отношения в XVIII – середине XIX века // Вопросы истории. 1998. № 2 С. 47–59 и др.
8. *Мальбахов Б. К., Эльмесов А. М.* Средневековая Кабарда. Внутренние и внешние аспекты истории. Нальчик, 1994; *Дзамихов К. Ф.* Адыги: вехи истории. Нальчик, 1994
9. *Дзамихов К. Ф.* Адыги и Россия. Формы исторического взаимодействия. М., 2000. С. 110-123
10. Присоединение Кавказа к России. XIX век. СПб., 2005; Россия и Чечня. 200-летняя война: Сб. Сост. А. Блинский. СПб, 2000 и др.
11. *Гаджиев В. Г., Борохова И. М.* Н. И. Покровский и его роль в развитии отечественного кавказоведения // Научная мысль Кавказа. 1998. № 1. С. 72–79

## ЖУРНАЛІСЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ В. КНОРЫНА Ў 1917–1920 гг.

**Д. А. Марціновіч**

Пачатак журналісцкай дзейнасці Кнорына шчыльна звязаны з выданнем газеты «Звязда», якая першапачаткова выходзіла па-руску, і толькі з 1925 года на беларускай і рускай мовах (а з 1927 года толькі па-беларуску). Яе першы нумар выйшаў у Мінску 27 ліпеня 1917 года накладам 3000 асобнікаў [6, с. 100]. Спярша газета выдавалася як орган Мінскага камітэта РСДРП(б), а пасля Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б) [2, с. 122]. Як сцвярджае В.Солскі, рэдактарам «Звязды» прызначылі А.Мяснікова [6, с. 101], а вось аўтары «Гісторыі беларускай жуналістыкі» называюць першымі рэдактарамі М.Фрунзе і А.Мяснікова [2, с. 122]. Разам з тым прызначэнне Мяснікова мела фармальны характар, паколькі яго хоць і прызначалі на шматлікія пасады, але канкрэтную працу за галоўнага рэдактара рабілі іншыя [6, с. 101]. Газету фактычна выпускалі тры чалавекі: Кнорын (афіцыйна ён узначальваў аддзел унутранага і зарубежнага агляду, а таксама працаваў адказным сакратаром), яго памочнік Алібегаў і сакратар рэдакцыі Галкін, якія актыўна карысталіся «нажніцамі» (творча пераапрацоўвалі або проста перапісвалі асобныя матэрыялы з цэнтральных газет). Але гэта з’ява была распаўсюджана нядоўга, бо неўзабаве (у канцы ліпеня) бальшавіцкія цэнтральныя газеты былі закрыты па загаду Часовага ўрада.

У новых умовах газеце даводзілася самой выпрацоўваць свой курс. «Звязда» пісала аб праследаваннях бальшавікоў у Петраградзе і на фронце, выступала супраць Часовага ўрада, але вызначанай палітычнай лініі ў яе не было. Да намераў Леніна кіраўніцтва «Звязды» ставілася, калі верыць В.Солскаму, даволі скептычна. Кнорын увогуле быў праціўнікам такіх намераў [6, с. 116], у тым ліку і таму, што супрацоўнікам даводзілася працаваць у складаных мясцовых умовах, дзе значная ўлада

належала мясцовай ваеннай адміністрацыі, якая магла зачыніць газету. Менавіта гэтым было выклікана з'яўленне ў «Звяздзе» патрыятычных артыкулаў, у якіх усхвалялася мужнасць салдат на фронце. Яны пісаліся часцей за ўсё Кнорыным [6, с. 117], які хацеў выратаваць газету. Але гэта не дапамагло. 23 жніўня камісар Часовага ўрада Жданаў, які спаслаўся на загад камандуючага Заходнім фронтам, выдаў загад аб закрыцці «Звязды». Яе друкарня была канфіскавана.

15 верасня замест яе пачала выходзіць газета «Молат», галоўным рэдактарам якой быў прызначаны В.Кнорын. Апошняе рашэнне было зацверджана на Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РСДРП(б), якая праходзіла 15-18 верасня 1917 года. Паводле словаў самой рэдакцыі, «Молат» быў працягам закрытай 23 жніўня «Звязды». Газета паспела выдаць 18 нумароў [2, с. 125], пасля чаго 6 кастрычніка была зачынена. Да гэтага прывёў рапарт камандуючага Заходнім фронтам генерала Балуева Вярхоўнаму галоўнакамандуючаму. Балуеў пісаў, што «Молат» вылівае цэлыя патокі бруду на вышэйшы камандны склад і афіцэрства» [6, с. 133], што адначасова вярхоўнае камандаванне абвінавачваецца ў зацягванні вайны з мэтай задушэння дэмакратыі. Балуеў прывёў шмат цытат з «Молата» і запатрабаваў распараджэння аб закрыцці газеты і рэквізіцыі тыпаграфіі, паколькі «характар дзейнасці «Молата» трэба прызнаць безумоўна шкодным у чыста ваенных адносінах» [6, с. 133]. Газета, на думку генерала, адмоўна дзейнічала на армію. Неўзабаве «Молат» быў закрыты, але канфіскаваць тыпаграфію ўлады не здолелі, паколькі яе ахоўвалі па-бальшавіцку настроеныя ўзброеныя салдаты.

Паколькі тыпаграфію бальшавікі захавалі, на 2-ой надзвычайнай Паўночна-Заходняй канферэнцыі РСДРП(б), было прынятае рашэнне выдаваць замест «Молата» новую газету пад назвай «Буравеснік», якая стала выходзіць з 8 кастрычніка. Галоўным рэдактарам застаўся В.Кнорын. Як сцвярджае В.Солскі, традыцыі выкарыстання «нажніц» захоўваліся: «бальшавіцкая прэса.. перадрукоўвала… артыкулы з газеты “Рабочы шлях”», якая «замяніла петраградскую “Праўду”, што была зачынена пасля ліпеньскіх падзей... “Рабочы шлях” у Мінску нельга было атрымаць. Сувязь з цэнтрам яшчэ пагоршылася, акрамя таго цалкам развалілася пошта... Бальшавікі неяк ухітраліся атрымліваць адзін-два нумара “Рабочага шляху”. У іх тады друкаваліся лісты Леніна. “Молат”, а потым “Буравеснік” гэтыя лісты перадрукоўвалі. Ленін тады адкрыта пісаў пра паўстанне, час для якога, на яго думку, ужо наступіў. Такая пазіцыя знаходзілася ў яўнай супярэчнасці з палітыкай бальшавікоў Заходняй вобласці» [6, с.136].

Тым не менш, пазіцыя У.Леніна перамагла. 25 кастрычніка (7 лістапада па новым стылі; у далейшым даты падаюцца менавіта па новым стылі) у Петраградзе адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. У той жа дзень у Мінску выйшаў чарговы нумар газеты «Буравеснік» з адозвай, якую напісаў Кнорын.

Пад назвай «Буравеснік» газета выходзіла да 1 лістапада 1917 года, пасля чаго вярнулася да сваёй першапачатковай назвы «Звязда». «Сёння мы звяртаемся да сваёй першапачатковай назвы, да нашай “Звязды”. З яе мы пачыналі сваю цяжкую працу ў заходнім краі і з ёю разам у гэтыя адказныя дні пойдзем да поўнай перамогі...» – сцвярджалася ў перадавым артыкуле «Звязды» за той дзень [4].

У наступныя месяцы актыўнасць журналісцкай дзейнасці В.Кнорына перажывае відавочны спад. Журналістыка ў яго жыцці часова адышла на другі план, паколькі Кнорын займаў шэраг адказных пасад. Так, у апошнія месяцы 1917 года ён з’яўляўся членам Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Заходняга фронту і Паўночна-Заходняй вобласці, упраўляючым справамі Саўнаркома пры Абласным выканаўчым камітэце Саветаў Заходняй вобласці і фронта (Аблвыканкамзаху), замаў асобныя іншыя пасады.

Журналісцкая дзейнасць В.Кнорына аднавілася ў лютым 1918 года, калі ён пераехаў у Смаленск, куды з-за наступлення нямецкіх войскаў, што пачалося 18 лютага 1918 года, быў перанесены з Мінску цэнтр Заходняй вобласці. У гэтым горадзе Кнорын працаваў да снежня 1918 года і рэдагаваў газеты «Звязда» (газета Паўночна-Заходняга абласнога і Смаленскага губернскага камітэтаў РКП(б), «Известия» [3, с. 108], якая, відаць, была адной з мясцовых смаленскіх газет, і «Заходняя камуна» (афіцыйны орган выканкома Саветаў Заходняй вобласці – Заходняй Камуны).

У пачатку 1919 года, адзначанага абвяшчэннем незалежнасці БССР, у журналісцкай дзейнасці Кнорына адбыліся пэўныя змены. 2 студзеня 1919 года на 3-ім пасяджэнні Цэнтральнага бюро Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі па пытанні аб друкаваных органах была прынятая наступная пастанова: «Газета «Звязда» пераводзіцца ў Мінск, у рэдакцыйную калегію ўваходзяць тт. Мяснікоў і Кнорын» [1, с. 50].

Але ў першую палову 1919 года Вільгельм Кнорын, захоплены палітычнымі падзеямі журналістыкай актыўна не займаўся. З пачаткам польскай акупацыі ён зноў пераехаў у Смаленск, дзе працаваў з жніўня 1919 да 12 чэрвеня 1920 года. Там Кнорын займаў пасаду ваеннага камандзіра Смаленскай акругі. Адначасова з восені 1919 года В.Кнорын

працягваў выданне газеты «Звязда» як штотыднёвіка (выданне выходзіла ў Смаленску да жніўня 1920 года).

Адначасова з 1 лютага 1920 года ў Смаленску на беларускай мове выходзіла газета «Савецкая Беларусь» (выдавалася да 1933 года). Першыя дзесяць нумароў выдаваліся два разы на тыдзень рэдакцыйнай калегіяй ЦК КП(б) Літвы і Беларусі як двухтыднёвы часопіс [5, с. 198]. Першы нумар быў падпісаны рэдактарамі А.Бурбісам, В.Кнорыным, А.Чарвяковым, Ф.Шантыром. Яны ж склалі першую рэдкалегію газеты, якая без зменаў функцыянавала да выдання чацвёртага нумара, пасля чаго яе склад змяніўся, і Кнорын там больш не фігурыраваў [2, с.140].

Журналісцкая дзейнасць Вільгельма Кнорына была даволі актыўнай, хоць і не аднароднай. Яна характарызавалася як творчай, так і арганізатарскай актыўнасцю В.Кнорына, які ў дастаткова складаных умовах не толькі пісаў для газет шэраг матэрыялаў і перадавых артыкулаў, але часам быў вымушаны арганізоўваць газетнае выданне. Месцамі працы В.Кнорына былі Мінск, а таксама Смаленск, аўдыторыяй – насельніцтва этнічнай часткі Беларусі, а таксама асобных заходніх раёнаў Расіі, якія ў 1918 годзе ўваходзілі ў Заходнюю камуну.

Можна канстатаваць, што Вільгельм Кнорыну стаяў ля вытокаў беларускай бальшавіцкай журналістыкі.

**Літаратура**


1. 1 января 1919 года: Временное рабоче-крестьянское советское правительство Белоруссии: документы и материалы. – Мн., 2005.
2. *Булацкі Р.В., Сачанка І.І., Говін С.В.* Гісторыя беларускай журналістыкі. – Мн., 1979.
3. Вильгельм Георгиевич Кнорин// История СССР. 1967. № 2. – С. 105-110.
4. Звезда. 1917. 1 ноября.
5. *Конан У.* «Савецкая Беларусь»// Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6 Кн. 1. – Мн., 2001. – С. 198.
6. *Солский В.* 1917 год в Западной области и на Западном фронте. – Мн., 2004.


## АВЕСТИЙСКОЕ ЖРЕЧЕСТВО И ПРОБЛЕМЫ ЕГО ПОНИМАНИЯ


**А. С. Миксюк**


Авеста – священная книга зороастрийцев и древнейший письменный памятник иранцев. Ее создание, судя по особенностям языка, содержанию и ряду социально-исторических моментов, относят к IX-VI вв. до н. э., а родиной принято считать Среднюю Азию.

Нет сомнений в том, что жречество играло особую роль в древнеиранском обществе. Однако обрывочность сведений, а также большое коли-